Слова для Жыцця (78)

Аўтар: Рэдакцыя
12.10.2014 01:00

Папа Францішак

З самага пачатку Бог напоўніў Касцёл асаблівымі дарамі Святога Духа – харызмамі. Харызмы – гэта ласкі, дары, дадзеныя Богам веруючаму чалавеку, каб з бескарыслівасцю і любоўю ён мог рабіць іх даступнымі ў службе на карысць цэлай супольнасці, на карысць усім. Трэба падкрэсліць, што чалавек не можа сам зразумець, ці валодае ён харызмай і якая яна. Дары, якімі напаўняе нас Айцец, нараджаюцца і развіваюцца ў супольнасці. Гэта ў супольнасці мы вучымся распазнаваць іх як знакі Яго любові для ўсіх Яго дзяцей.

Бог напаўняе свой Касцёл многімі рознымі харызмамі. Усе яны служаць гарманічнаму развіццю чалавека ў веры і ў Божай любові. Яны не могуць быць прычынай для зайздрасці і падзелаў! У хрысціянскай супольнасці мы патрэбны адзін аднаму, а кожны атрыманы дар рэалізуецца поўнасцю, калі мы дзелімся ім з братамі, на карысць усіх.

Фрагмент з Генеральнай аўдыенцыі Святога Айца, 01.10.2014 †

Кс. абп Тадэвуш Кандрусевіч

Адной з праблем сучаснага чалавека з’яўляецца занядбанне практыкі як супольнай, так і асабістай малітвы. Асаблівую трывогу выклікае занядбанне супольнай малітвы ў сем’ях, калі разам моляцца бацькі і дзеці. Ружанец якраз можа дапамагчы ўсім членам сям’і сабрацца разам на супольнай малітве. Ён спрыяе не толькі паглыбленню самой малітвы як размовы душы з Богам, але і ўмацаванню сям’і як хатняга Касцёла і месца

першай евангелізацыі. Ружанец таксама можа дапамагчы ў будаванні братэрскіх, суседскіх сувязяў з іншымі людзьмі, калі яны будуць маліцца разам. Таму неабходна адраджаць і ўмацоўваць практыку сумеснай ружанцовай малітвы ў ружанцовых колах, сем'ях, паміж суседзямі і ў касцёлах, асабліва перад святой Імшой.

Урывак з прамовы з нагоды распачацця Кангрэса святога Ружанца